В белорусских университетах время учебы строго ограничено. В Америке можно учиться хоть всю жизнь. Для получения диплома необходимо набрать определенное количество «очков» (credits) за освоенные курсы. Сколько времени на это потребуется — проблема студента. Женя училась пять лет. Но ей повезло: часть credits (примерно в годовом объеме) она получила за изучение предметов в Академии управления в Минске.

> ***Америка — страна эмигрантов, поэтому факт вашего неамериканского происхождения не делает вас человеком второго сорта.***

С поиском работы особых проблем не возникло, так как первая половина «нулевых» — это время активного выхода на пенсию многочисленного послевоенного поколения (поколения беби-бумеров). Как правило, свою первую работу выпускники университетов находят на «ярмарках вакансий». Моя дочь не была исключением. Один из крупнейших химических концернов Америки Praxair стал ее первым работодателем (белорусам пенсионного возраста Praxair известен под названием Union Carbide; 3 декабря 1984 г. в результате взрыва емкости с токсичным химикатом на одном из заводов концерна в индийском городе Бхопале погибло около 18 тыс. человек).

Работа в Praxair началась с 18-месячной стажировки, за время которой будущий инженер-технолог получила возможность детально ознакомиться с работой основных подразделений концерна (от разработки техпроцессов до финансов и маркетинга). При этом стажеру с первого дня выплачивалась заработная плата в полном объеме.

В связи с этим не могу не вспомнить свой первый рабочий день в должности мастера на ПО «Интеграл» в 1974 г., завершившийся матом, которым замначальника цеха покрыл

меня за невыполненное сменное задание (мой предшественник, снятый с должности, не выполнял его в течение полугода).

Члены семьи инженеров крупной компании в Америке (Женя вышла замуж за сокурсника) по своему социальному статусу — типичные представители среднего класса. В материальном плане это подразумевает собственный дом (в кредит), новые автомобили и отпуск в Мексике или на Багамских островах.

Вопреки научно-популярной литературе

Мой сын Дима переехал в Америку после «окончания» 9-го класса. Кавычки в данном случае я поставил не случайно, так как к экзаменам он не был допущен ввиду систематических пропусков занятий. Но учеба на сплошные тройки с жирными минусами была лишь цветочками по сравнению со звонками из отделения милиции, где он оказывался по причине нахождения на улице в нетрезвом виде.

Для реализации американской мечты желательно иметь университетский диплом. Образование платное. Но для эмигранта в первом поколении оно доступно, при условии что он готов «пахать».

В ближайшей школе в Нью-Йорке отсутствие документов об уровне школьной подготовки никого не смутило. Реальные знания выяснили с помощь тестов, на основании которых и был определен класс по каждому предмету. Нулевой английский не стал существенным препятствием для учебы. Для детей иммигрантов в школе были классы, в которых английский преподавался как второй язык (english as a second language). Большинство учителей владело русским языком. Однако это исключение, а не правило. Все дело в большом количестве русскоязычных иммигрантов в главном городе восточного побережья Америки.

Нью-Йорк — город контрастов. Найти компанию сверстников с аналогичными интересами не проблема. Интересы моего сына не являлись тайной. Ближе к концу первого года учебы я стал получать письма на стандартных бланках, из которых следовало, что Дима пропустил занятия в понедельник, вторник, среду, четверг и пятницу.

Что я мог сделать? Утром — на работу. Домой — не раньше 18.00. Жена, к этому моменту уже с приставкой экс, была поглощена обустройством нового семейного очага. Осознав бесполезность своих усилий, я решил дезертировать с педагогического фронта и покинуть Америчку (так любовно называют свою новую родину жители Брайтона).

Прошло 17 лет. Сегодня Дима — сотрудник крупнейшей телекоммуникационной американской компании Verizon. Высшего образования он не получил, но кроме работы у него есть только одно увлечение в жизни — учеба. Последнее его достижение — лицензия на проектирование компьютерных сетей.

Как белорусский школьник, неспособный самостоятельно подготовиться к уроку географии, стал трудоголиком — мне понять не дано. Я был уверен, что базовые характеристики человека формируются к пяти годам (спасибо научно-популярной литературе), а дальше идет простое накопление знаний. Сказка Андерсена про гадкого утенка, безусловно, шедевр мировой литературы. Но это сказка, а в жизни мне неоднократно приходилось наблюдать обратный процесс, когда вполне оформившиеся лебеди превращались в гадких утят. Как правило, с помощью водки.

Учиться никогда не поздно

В Америке около 4,5 тыс. высших учебных заведений, в которых в 2014 г. обучалось 890 тыс. иностранных студентов. Каждый четвертый — китаец. Информацией о количестве белорусских студентов я не располагаю. Родное «государство для народа» обучение за границей не поощряет. Оно не видит в этом смысла. Как тут не привести цитату из доклада Лукашенко на пятом Всебелорусском народном собрании: «По показателям доступности образования — поступлению детей в школу, количеству студентов учреждений высшего образования — Беларусь находится на уровне высокоразвитых стран и опережает многие страны Европы и мира».

По количеству студентов мы в лидерах. Не спорю. А как с качеством образования?

В 2013 г. моя старшая дочь Юля поступила в университет штата Делавэр. Ей не повезло

С каким из следующих утверждений о белорусском государстве, построенном при президенте Лукашенко, Вы бы согласились? (процент от числа опрошенных)

Вариант ответа	Все опрошенные	Отношение к Лукашенко	
		Доверяют	Не доверяют
Это мое государство, оно защищает мои интересы	30	62	6
Это лишь отчасти мое государство, оно недостаточно защищает интересы таких, как я	47	25	63
Это не мое государство, оно не защищает мои интересы, и я не доверяю ему	15	6	25
ЗО/НО	8	7	6

НИСЭПИ, июнь 2016

с лотереей грин-карт, но повезло с учебой. Во-первых, ее зачислили сразу на магистерскую программу. Во-вторых, университет оплатил 90% стоимости учебы. В-третьих, он предоставил ей работу.

Студенческая виза дает право на переезд в Америку членам семьи студента, однако без права на работу, поэтому муж дочери остался в Минске, а двое моих внуков стали американскими школьниками. Адаптировались они без особых проблем, несмотря на отсутствие специализированных классов с english as a second language.

Совмещать учебу в университете, работу и воспитание детей — дело непростое. Возникает проблема времени, которого катастрофически не хватает, но есть и проблема денег. Цены в Америке далеко не белорусские. Только за аренду квартиры приходится выкладывать 1 тыс. долларов ежемесячно. Безусловно, пришлось влезть в долги.

Тем не менее за два года Юля с магистерской программой справилась и в год своего сорокалетия защитила дипломную работу по теме «Гражданское общество в Беларуси».

Учиться никогда не поздно. Руководствуясь данным принципом, она решила продолжить образование и поступила на докторскую программу (Philosophiæ Doctor, PhD). Программа рассчитана на 4 года. Таким образом, в семье белорусского политолога-любителя Сергея Николюка с высокой степенью вероятности появится доктор социологии, получивший научную степень в американском университете.

Вот такие истории из семейного альбома.

Немного социологии

В довоенном советском фильме «Дети капитана Гранта» была песенка про веселый ветер с жизнеутверждающими словами: «Кто весел — тот смеется. Кто хочет — тот добьется. Кто ищет — тот всегда найдет!». Фильм вышел накануне Большого террора, в 1936 г. Одна из главных целей советского оптимизма, активно внедряемого пропагандой, заключалась в мобилизации индивидуальной энергии людей на реализацию интересов тоталитарного государства. Интересы самих людей при этом в расчет не брались.

Мобилизационные возможности современного белорусского государства несравнимы с возможностями его советского предшественника, поэтому оно опирается не на активность, а на пассивность населения. Проведение парламентских выборов «в скучном режиме» (термин Лукашенко) — лишь один из примеров блокировки политической активности белорусов.

Всю политическую активность замкнуло на себя родное государство, «государство для народа». Однако вопреки официальной мифологии в качестве своего его безоговорочно воспринимают менее трети белорусов (см. таблицу).

Своим белорусское государство считают 54% пожилых людей старше 60 лет и только 22% молодежи (от 18 до 29 лет); 70% с начальным образованием и 22% с высшим. Стоит ли после этого удивляться, что абсолютное большинство молодых и образованных декларируют желание выехать на ПМЖ в Европу и Америку.

Разумеется, практические шаги для переезда предпринимают считанные проценты. Но это самые энергичные граждане. Это те, кто готов на начальном этапе на новом месте съесть свою ложку весьма неприятной на вкус субстанции. Чтобы потом забыть этот запах навсегда, т. е. больше не мыть полиэтиленовые пакеты и не штопать колготки…

Пра любоў, чалавекапавал і бясчассе

Пра гэта пісала і піша душа паэта. Ён прызнаны і таленавіты. У нечым апальны. Як некаторыя, ён мог быць абласканы ўладай. Але ці патрэбна гэта сапраўднаму мастаку, калі ты ўжо не зможаш пісаць пра неабдымнае неба, якое ахінае нашу грэшную зямлю. Пра зоркі, якіяміргаюць і плачуць, гледзячы на тое, як беларусы губляюць сваю гістарычную памяць, мову, культуру і годнасць. Сяргей ЗАКОННІКАЎ не проста марыць, а штодня працуе над тым, каб наша нацыя стала сапраўды моцнай і годнай. Гутарым у кватэры паэта на самым апошнім паверсе, пад самым небам…

Уладзімір ДЗЮБА

— Сяргей Іванавіч, у тваёй творчасці заўсёды прысутнічала хвалюючая грамадзянская тэма. Аднак гэтыя пранізлівыя ноты ніколі не заглушалі мелодыю любові, якая гучала нават у самыя цяжкія часы. Скажы, калі ласка, ці ратавала цябе любоў у цяжкія хвіліны? Свой першы верш ты прысвяціў жанчыне, ці памыляюся?

— Не, не памыляешся. Трэба падзяляць любоў і каханне. Любоў убірае ў сябе і каханне. Каханне — гэта асобна. І калі гаварыць пра жанчыну, то я напісаў такі кароценькі вершык. Напісаў экспромтам, таму што Анатоль Сыс — быў такі таленавіты паэт са сваім складаным лёсам — аднойчы прыйшоў да мяне і кажа: «Я напісаў верш экспромтам і Валодзя Някляеў даў мне сто долараў. А ты можаш так напісаць?» Я кажу: «Гледзячы пра што». А ён: «Напішы пра каханне, пра жанчыну і… хуценька так». Я пытаюся: «Ты што, дасі мне 100 долараў?» — «Не, — кажа. — Я злётаю да Някляева і ў яго папрашу». Добра, кажу, долары мне твае не патрэбныя, але зараз

што-небудзь прыдумаем… Я прысеў, засяродзіўся і напісаў:

Ёсць назвы і болей нічога:
Жанчына, каханне, жыццё.
Замкнута ад нас адкрыццё,
А ключ пад падушкай у Бога.

Анатоль стаяў на каленях перад сталом. Ён заўсёды быў такі эпатажны, артыстычны, эмацыянальны. І калі ён пачуў пра «ключ пад падушкай у Бога», то сказаў: «Да-а-а… Ты добра напісаў».

Па жыцці мяне ўвесь час ратавалі жанчыны, а мужчыны мне прыносілі толькі шкоду. Я гэта гавару адкрыта, бо так насамрэч атрымалася. Пачынаючы са студэнцкіх часоў, калі мяне хацелі несправядліва выключыць і з камсамола, і з універсітэта. Потым далі строгую вымову па камсамольскай лініі з занясеннем у картку, выгналі мяне з інтэрната і я па вакзалах начаваў… І ўсё гэта заканчвалася тым, што мяне ратавалі жанчыны. Адзіная студэнтка, Ліда Пістуновіч, якая была членам камітэта камсамола, уступілася за мяне. Я тады вучыўся на першым курсе ў БДУ, на філфаку. Мяне проста хацелі знішчыць…

— За што?

— За тое, што я напісаў праўду ў адносінах да аднаго супрацоўніка раённай газеты, які павёў сябе несумленна. І яшчэ да гэтай справы мелі дачыненне два карэспандэнты газеты «Знамя юности» і адзін наш вядомы паэт.

— І пачалі цябе душыць?

— Так. Гэта я ўспамінаю выпадак з маладосці, можна сказаць, юнацтва. І далей па жыцці мяне ўвесь час ратавалі жанчыны. Яны былі побач са мной усё жыццё: у мяне дзве дачкі, жонка, у мяне цешча была. І нават сабаку звалі Дашкай. І ўсе да мяне ставіліся вельмі добра, а я да іх. Шчыра скажу, што ў мяне ёсць эсэ «Думаю пра цябе», даўно напісаў. Яно вельмі спадабалася чытачам, асабліва, канечне, жанчынам, і было надрукавана ў часопісе «Беларусь». Там я пастараўся як паэт асэнсаваць лёс беларускай жанчыны. Лёс нашых бабулек, прабабулек і… да сённяшняга дня. Што такое жанчына для Беларусі, якая яе роля ў тым, што мы захавалі сваю нацыю. Якая б яна ні была — затурканая кімсьці, дабітая сёння, палахлівая, але тым не менш мы пранеслі яе праз часы на далікатных плячах жанчыны. Колькі войнаў было, выбілі ўсё тут! Потым рэпрэсіі — каго больш выбівалі? Мужчын! Рэвалюцыя павыбівала таксама. І ўсё цягнулі жанчыны — і плугі, і хамуты, і дзяцей. Таму роля беларускай жанчыны да канца не ацэненая.

Маладая сям'я Законнікавых

— Людзі больш сталага пакалення ў 1970-я і нават на пачатку 1980-х шчыра верылі ў камуністычныя ідэалы, але прыйшло горкае расчараванне. Калі ж змяніўся твой палітычны светапогляд?

— У гэтым пераасэнсаванні мне дапамагло тое, што ў мяне быў дзядзька Сяргей Ракіта (Сяргей Васільевіч Законнікаў). Гэта паэт маладнякоўскага прызыву 1930-х. Яго рэпрэсіравалі ў самым росквіце сіл у 1936 годзе, калі яму было 27 гадоў. Ён толькі паспеў выпусціць калектыўны зборнік вершаў і свой «Я агітую за пяцігодку». Нават назва зборніка гаворыць за сябе. Хлопцы ж гэтыя былі апантаныя, яны верылі новым савецкім уладам… Але былі разумнымі і пачалі прыглядацца — што ж насамрэч робіць гэтая ўлада. А дзядзьку майго загрэблі за тое, што ён абараняў Янку Купалу і публічна выступіў у яго

Ніл Гілевіч,
Сяргей Законнікаў,
Максім Танк.
1981 г.

абарону. На Купалу ў той час былі нападкі, што ён нацыяналіст і г. д. Потым мой дзядзька публічна выступіў супраць калгасаў і сказаў, што калгасы — гэта дзяржаўны канцлагер, куды зганяюць людзей. І яго ўзялі «на заметку». Урэшце яго абвінавацілі ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Бо маладыя паэты збіраліся, вершы чыталі, слухалі крытычныя прамовы Троцкага. Яны хацелі разабрацца, што гэта за ўлада, як далей жыць і што рабіць. А яшчэ дзядзька выступіў супраць наркамаўкі і сказаў, што новы правапіс вельмі адмоўна паўплывае на развіццё нашай мовы. І што будзе нанесена шкода ў валоданні роднай мовай усяму насельніцтву Беларусі. Сяргея Ракіту за гэтыя выказванні таксама абвінавацілі. І вось я сёння пытаюся, а ў чым не меў рацыі мой дзядзька? Тым больш што ён не быў заклятым ворагам савецкай улады, а крытыкаваў тое, што яму не падабалася.

— Ён жа дбаў пра дабрабыт людзей, змагаўся за мову, за Бацькаўшчыну…

— Так! Ягоны бацька Васіль, то бок мой дзед Васіль Іванавіч, калі вярнуўся з фронта пасля Першай імперыялістычнай, быў старшынёй камбеда. Ён таксама быў за савецкую ўладу, але супраць калгасаў, куды прымусам зганялі людзей і жывёлу. Мяне асабліва ўразіў расказ бацькі, як у тых калгасах па-дзікунску адносіліся да жывёлы. Дбайныя гаспадары гэтых коней ды каровак дагледжвалі, яны маліліся на іх! А ў калгасе заганялі скаціну ў стойла і яна там мёрла…

Потым я пачаў пытацца пра свайго дзядзьку, шукаць… Мы пачалі гэта рабіць толькі тады, калі прайшла рэабілітацыя. Да гэтага бацька нам нічога не расказваў, бо баяўся, што малыя дзеці могуць недзе прагаварыцца. Калі дзядзьку забралі, бацька быў напалоханы страшна. І калі з Мінска прыйшоў ліст, што трэба забраць дзядзькавы ганарары, бабуля сказала майму бацьку: «Іван, не трэба ехаць, бо заграбуць і цябе».

Спачатку мой дзядзька Сяргей сядзеў у перасыльнай турме ў Магілёве, а потым яго адправілі па этапу ў Ніжні Ноўгарад, тагачасны горад Горкі. Туды да яго ездзіла маці, мая бабуля. Яна мне расказвала, як прывезла яму валёнкі, шкарпэткі цёплыя. Пірагоў напякла, у нас яны называюцца лапуны — праснакі такія, што доўга захоўваюцца. А наглядчыкі пры ёй дзялілі гэтыя рэчы паміж сабой. А потым сказалі: «Ну что, мамаша, хлебца привезла? Но твой сын обеспечен, он у нас как на курорте, все у нас тут хорошо. А хлеб проверим, может, пилочку какую спрятала…» Усе пірагі паламалі, а цяпер, кажуць, «пусть ест наздоровье». «А ты, мамаша, едь потихоньку в свою Белоруссию. Ты с ним не встретишься. Не волнуйся, он на свежем воздухе, в лесу».

Васіль Быкаў, Сяргей Законнікаў,
лётчык і пісьменнік Анатоль Сульянаў

— А дзядзька рабіў на лесапавале, дзе былі катаржныя ўмовы працы. Там, відаць, ён і загінуў?

— Загінуў невядома дзе. Яшчэ раней я напісаў вершы, якія аказаліся прароцкімі, я падазраваў, што ён загінуў не проста на лесапавале. І гэта пацвердзілася ў апошнія гады новымі дакументамі пра лёс дзядзькі. Я напісаў, што палітычныя асуджаныя ў ягоным лагеры паднялі паўстанне ў 1941 годзе, калі пачалася вайна. Бо ў той жа самы дзень, 22 чэрвеня, вязні даведаліся пра вайну. І яны ўчынілі бунт з патрабаваннем, каб іх

ЦК КПБ, аддзел культуры. Злева направа: Уладзімір Гілеп (загадчык сектара мастацтваў), Сяргей Законнікаў (загадчык сектара мастацкай літаратуры), Генадзь Бураўкін (старшыня Дзяржтэлерадыё БССР), Іван Антановіч (загадчык аддзела культуры ЦК КПБ). Пачатак 1980-х гг.

адправілі на фронт. І вось дакументы сведчаць, што першы раз дзядзьку судзілі ў 1936 годзе, калі далі 10 гадоў. А ў чэрвені 1941-га яго судзіла ўжо лагерная «тройка» за ўдзел у паўстанні. І невядома, чым там усё скончылася, таму месца, дзе пахаваны дзядзька, невядомае.

— Як і сотняў тысяч вязняў сталінскага ГУЛАГа з Беларусі ды іншых савецкіх рэспублік.

— Літаральна. І я напісаў у вершы, які называецца «Лесапавал»:

Можа ў дол пахавалі,
Можа сняжком замяло.
На Чалавекапавале
Нормы тады не было.

Так я ўвёў у літаратуру слова «чалавекапавал». Дзядзька пахаваны недзе ў раёне чыгуначнай станцыі Суха-Бязводнае, дзе ў той час было шмат лагераў. Там пакутавалі не толькі палітычныя вязні, там сядзелі крымінальнікі, там былі лагеры для жанчын і асобна для дзяцей і падлеткаў. Я прачытаў у інтэрнэце расповед расійскіх журналістаў, што цяпер на тым жа месцы знаходзяцца сучасныя лагеры, так званыя зоны.

— Сяргей Іванавіч, я думаю, што абурэнне, нязгода з несправядлівасцю і прага да праўды таксама падштурхоўваюць да працы. І тут ужо, відаць, не да лірыкі. Што цябе натхняла раней і падштурхоўвае да творчасці цяпер, у сталыя гады?

— Я неяк задумаўся, чаму я пачаў пісаць. Мне здаецца, маюць рацыю тыя людзі, якія лічаць, што многае закладзена ў генах. Магчыма, калі б не лёс майго дзядзькі, то я б і не пісаў. Аднак не толькі мой дзядзька, але і бацька пісаў вершы і нават друкаваўся перад самым пачаткам вайны. Ён яшчэ зусім маладым хлопцам павінен быў ехаць у Мінск, каб адрэдагаваць свой першы зборнік. Ён быў настаўнікам, а пасля вайны яго дырэктарам школы прызначылі. Усё спалена, разбурана, ні дошкі табе, ні цвіка… Але бацька здолеў пабудаваць некалькі школ у той час. Так што ў генах маіх нешта ёсць. А другое, пра што ты казаў… Як я сябе памятаю, усё пачынаецца з любові. Калі мы становімся дарослымі, мы трошкі шырэй разумеем гэта слова, яно становіцца больш аб'ёмным. А на той час, калі ты малы, ты любіш тое, што вакол цябе. Калі пачытаць мае самыя першыя вершы, то я захапляўся лясамі, сярод якіх жыў, сваімі азёрамі, дзе на чоўне лавіў рыбу. З маленства я любіў прыроду і хацеў яе ўславіць у сваіх радках. Гэта мая родная зямля! Пра чалавека я тады не думаў. Пра чалавека я пазней пачаў думаць: хто і што ён у гэтай прыродзе.

Сяргей Законнікаў і Пімен Панчанка. 1983 г.

— А калі з'явілася грамадзянскае гучанне ў тваіх вершах? Людзей з абвостраным пачуццём справядлівасці няшмат, але ва ўсе часы гэта былі самыя сумленныя людзі — літаратары, журналісты, мастакі. Ім цяжка было, бо яны ўсё жыццё змагаліся за праўду і шукалі справядлівасць. Калі ты стаў успрымаць свет больш крытычна?

— Тут, Валодзя, вось якая рэч… Я ж не толькі вершы пісаў. У школе я быў, можна сказаць, селькорам: яшчэ малым пісаў заметкі ў раённую газету. Потым я падрос і працягваў пісаць, у рэдакцыях гэта віталі. Калі вучыўся ў дзявятым класе, то мой нарыс нават надрукавалі ў газеце «Советская культура», органе ЦК КПСС. І вось гэтыя занятак

На 150-годдзі Францішка Багушэвіча

пачатковай, «школьнай» журналістыкай шмат што мне даваў. Бо была зваротная сувязь: прымаюць мой матэрыял ці не або мой артыкул выклікае нейкі скандал. Напрыклад, калі я пісаў пра браканьераў, як зараз кажуць, я падстаўляўся. Ты ж разумееш, што такое ў вёсцы пісаць пра браканьераў…

— Творчая эліта стагоддзямі ў самых розных краінах займалася асветніцкай дзейнасцю, каб абудзіць у людзей пачуццё гонару, годнасці. Часта дзеля гэтага яе прадстаўнікі ахвяравалі не толькі сваім здароўем, але і жыццём. І, на жаль, многія з іх адчулі боль расчаравання, бо народ так нічога і не ўсвядоміў, не стаў маналітнай, годнай нацыяй. А застаўся масай, якой кіравалі і кіруюць палітыкі-прайдзісветы. Мы не маем права — ні ты, ні я — увогуле судзіць народ. Аднак ці было ў тваёй душы расчараванне? Нам усім хацелася дэмакратычных перамен напачатку 1990-х, але надзеі не спраўдзіліся.

— Думаю, тут наогул нікога судзіць не трэба… Вернемся да таго, пра што мы толькі што гаварылі. Праца селькора у палітычнам плане мне дала многае. Былі скандалы, было супрацьстаянне з браканьерамі, супрацьстаянне з кіраўніцтвам саўгаса, дзе я жыў, бо я пісаў пра недахопы, якія бачыў. Асабліва мяне ўразіла палеміка з былымі камандзірамі партызанскіх брыгад пасля майго артыкула «Дзяўчына з легенды». Я напісаў пра дзяўчыну-падпольшчыцу з маёй вёскі Глыбачкі, якая пякла хлеб для партызан. Яе гестапаўцы затрымалі з гэтым хлебам і закатавалі, а ёй не было нават 18 гадоў. Я напісаў нарыс, які ўслаўляў гэтае патрыятычнае дзяўчо. Два камбрыгі прачыталі гэты матэрыял і не заўважылі там сваіх прозвішчаў, не было сказана пра іх брыгады і пра тое, што гэта яны кіраўнікі ўсяго партызанскага руху на Віцебшчыне. І што гэта дзяўчына была ў іх у падчыненні, і што гэта яны (!) выхавалі такую дзяўчыну. Хаця яе вахавалі бацькі, яе сям'я. І вось яны на мяне, дзевяцікласніка, абрынуліся — два камбрыгі з ордэнамі, званнямі… І газета «Віцебскі рабочы» на цэлы год адмовілася друкаваць мае матэрыялы. Мяне запрасіў у Віцебск галоўны рэдактар і сказаў: «Сяргей, ты добры хлопец, мы цябе любім і будзем надалей падтрымліваць… Аднак ты нас прабач, бо год мы цябе друкаваць не будзем. Пакуль не супакояцца гэтыя мастадонты». І вось тады я зразумеў, што такое праўда-няпраўда, што такое амбіцыі ганарыстых людзей, якім было напляваць на лёс гэтай дзяўчынкі. Бо іх цікавіла толькі асабістая слава, каб яшчэ раз у абласной газеце расказалі, што «Іван Іванавіч» быў камбрыгам, а ў той брыгадзе была такая падпольшчыца. На такіх прыкладах я вучыўся нянавісці да ўсякай мярзоты, да чалавечай зайздрасці і подласці, нежадання зразумець іншага чалавека. І таму ў нашым жыцці мы шмат што губляем з-за таго, што не ўмеем слухаць другога, не імкнемся зразумець яго, падыйсці да яго… Замест гэтага людзі пачынаюць лаянку паміж сабой.

— За савецкім часам было шмат прыстасавальніцтва, тагачасная сістэма яго проста культывавала. Вядома, што халуі ў творчасці, мастацтве былі заўсёды, нават у старажытным Рыме пісалі салодкія оды дыктатарам. І цяпер хапае прыкарытнікаў, як трапна назваў іх у свой час Васіль Быкаў. Сёння прыкарытнікі паўсюль. Нягледзячы на эканамічны крызіс, яны ўбілі людзям у галаву, што ў нас паўсюль стабільнасць. Без сораму гаворыць пра стабільнасць вышэйшая ўлада. Некаторыя палітыкі ды грамадскія дзеячы называюць апошнія 20 гадоў часам «найноўшай гісторыі Беларусі». Аднак, шчыра прызнаюся, я не магу зразумець — чаму, хто гэта прыдумаў?! Хіба ў духоўным жыцці краіны, у сацыяльна-палітычнай ды эканамічнай



А. Пісьмянкоў, С. Законнікаў

Дні славянскай пісьменнасці і культуры. Выступае С. Законнікаў. 1990 г.

сферах адбыліся пэўныя зрухі? Я іх не бачу, бо працуе старая ідэалагічная мадэль, якая падаўляе вольнадумства ды ініцыятыву людзей. «Найноўшая гісторыя» павінна несці новы подых, які акрыляе грамадства, а тут настрой зусім сумны… Як бы ты наш час ахарактарызаваў?

— Тут можна развіць будзь здароў які філасофскі трактат! Аднак коратка: мы жывем у бясчассі! Як бы гэта ні было крыўдна для нашай улады. Чаму я так гавару? Бясчассе — гэта той час, у якім не будуецца нешта здаровае. Я таксама не магу на сённяшні дзень прымірыцца з вызначэннем «найноўшая гісторыя». Найноўшая гісторыя, калі на тое пайшло, гэта калі б мы пасля развалу Савецкага Саюза, на хвалі адмаўлення ад камуністычнай ідэі пачалі будаваць дэмакратычную дзяржаву. Справядлівую для ўсіх, дзе будуць гарманічна развівацца людзі, дзе будзе вяршэнстваваць толькі закон, перад якім павінны быць усе роўныя — ад прэзідэнта і да самага простага чалавека. Хаця я быў супраць інстытута прэзідэнцтва з той прычыны, што пры такой нізкай палітычнай культуры, якая пануе і сёння, можна было абыйсціся парламенцкай рэспублікай. Хаця, з другога боку, я разумею, што ў нашых умовах і гэтага нельга было зрабіць, бо ўсім хацелася прэзідэнта. Маўляў, ага! — у тых прэзідэнт, няхай і ў нас будзе. Таму што людзі не разумелі, што такое прэзідэнцкая рэспубліка. І я тады баяўся, што можа адбыцца, я пісаў пра гэта, выступаў публічна і не раз. І я не памыліўся, калі паглядзець, да чаго мы сёння прыйшлі.

Разгром у рэдакцыі часопіса «Полымя» з-за нацыянальнай пазіцыі. 1991 г.

Што я маю на ўвазе, калі гавару пра бясчассе. Мы хочам стварыць новую дзяржаву, пра што ўвесь час гаворым. Аднак будаўніцтва дзяржавы ўключае ў сябе шматлікія параметры. У тым ліку нацыянальнае пытанне, таму што мы мананацыянальная рэспубліка, у нас 83,4% беларусаў і мы павінны гэта ўлічваць. Гэта — нацыя, няхай з пэўнымі хібамі, але гэта нацыя! І яе трэба прымаць такой, якая яна ёсць. Не змаглі мы за XIX і XX стагоддзе вырасці як паўнавартасная нацыя з-за сваёй палітычнай неразвітасці, але ўсё адно мы — нацыя. І ў сусветным кантэксце нас павінны прымаць як паўнацэнную нацыю не па палітычных параметрах, а як этнас беларусаў. Нас жа хочуць наогул пазбавіць этнаса! Маўляў, беларусы — гэта рускія за знакам якасці. Што за лухта?! Я хачу быць тым, кім мяне нарадзіла маці, ад дзядоў і прадзедаў я — беларус. І тым ганаруся.

Стварэнне і згуртаванне нацыі, пабудова незалежнай дзяржавы — вельмі важныя працэсы. На жаль, нашы суайчыннікі гэтага не разумеюць. Маўляў, няма розніцы, на якой мове размаўляць: на рускай дык на рускай, на кітайскай — дык няхай сабе на кітайскай. Хаця ад мовы залежыць настрой нацыі. Як яна яна можа стварацца, як яна можа мацнець, як можа ў гэтым свеце знайсці сваю нішу і месца, калі ў яе няма нават сваёй мовы?! Таму у першую чаргу мяне вельмі хвалюе пытанне нацыястварэння. А потым і дзяржавастварэння. Бо я бачу, што наша сённяшняя аўтарытарная ўлада не звяртае на гэта ніякай увагі. Кіраўніцтва заклапочана толькі захаваннем сваіх мягкіх фатэляў. Бо яны даўно скемілі, што за ўладай стаяць вялікія грошы, якія можна змарнаваць ці прысабечыць, ты можаш распараджацца ўсім тваім народам як хочаш і г. д. Як вынік, поўная разбэшчанасць людзей у маральным плане. Спакон вякоў такое было, як толькі людзі з дыктатарскімі ці ўзурпатарскімі замашкамі дарываліся да ўлады.

І калі глядзіш на гэта ўсё, то бачыш, што паводле іхных планаў наперадзе няма нічога

Вечарына памяці Алеся Адамовіча. Мінск

дзяржавастваральнага: ну, існуе такая дзяржава, няхай сабе пакрысе існуе, на пазыках, расійскай халяве жывем — ну і жывем… Нічога стратэгічнага, каб узяць і падумаць, як можна мясцовыя рэсурсы скарыстаць, як зрабіць рэспубліку больш прывабнай, каб як мага больш турыстаў сюды заманіць… І галоўнае — распрацаваць такую стратэгію, каб уся дзяржаўная структура працавала на народ, каб беларусы ўрэшце сталі жыць заможна, больш культурна і г. д. Дык не! Сёння ўсё праўладнае чынавенства плюс сілавікі, уся гэта дзяржаўная машына, якую абывацель заўсёды баіцца, скіравана на тое, каб захаваць гэту ўладу.

Часта мы праводзім паралелі з савецкім часам. Дарэчы, я яго поўнасцю не адмятаю, бо за савецкім часам было многа чаго добрага. Але гэта быў час таталітарызму. І сённяшняя ўлада выйшла адтуль і забрала ўсё, што можна было забраць адмоўнае. Ды яшчэ памножыўшы гэта адмоўнае. Не магу сённяшнюю ўладу крытыкаваць поўнасцю, а толькі, магчыма, на 90 адсоткаў. Бо 10 адсоткаў нечага добрага ёсць, яно ёсць пры любой уладзе, нават дыктатарскай. Таму што грамадства супраціўляецца гэтай дыктатуры і нараджае нешта добрае. Напрыклад, як я магу сёння не прымаць тое, што нашы маладыя айцішнікі лепшыя ў свеце. Я таксама радуюся за нашых вядомых спартсменаў, якія цудоўна выступаюць і дабіваюцца перамог без усякіх допінгаў… Так што нешта добрае ёсць, аднак гэта толькі 10 адсоткаў! Вялікія грошы ідуць на тое, каб утрымліваць такую арду чыноўнікаў, сілавікоў, розных ідэолагаў ды цэнзараў. Яны затыкаюць рот людзям, якія хочуць сказаць праўду, хочуць свабодна размаўляць па-беларуску.

А мы, простыя людзі, таксама не будуем Беларусь, мы захоўваем аўтарытарную ўладу, бо мы ідзём і за яе галасуем. Таму я і кажу, што гэта — бясчассе! Ніякай «найноўшай гісторыі» у нас няма.

— На жаль, імпартаваць прагу да праўды, імкненне да праўды з-за мяжы немагчыма. Гэта павінна выспець у душах людзей. І працэс гэты вельмі цяжкі.

— Згодны. Аднак вышэй ты закрануў тэму асветніцтва. Я пра гэта гаварыў увесь час і буду паўтараць: асветніцтвам павінны займацца ўсе, у каго гэта атрымліваецца, не толькі паэты і пісьменнікі. Таму што асветнікаў у нас, калі гаварыць шчыра, вельмі мала.

— І далёка не кожны настаўнік, які вучыць беларускіх дзяцей, асветнік.

— Так, у нас сёння ідзе адукацыя, а выхаванне стаіць недзе ў баку. Я бываю ў школах і бачу, што выхаваннеператварылася ў ідэалагічную плынь: вось мы сход правялі, азнаёміліся з указам прэзідэнта, справаздачу напісалі і г. д. Я цікавіўся аналагічнымі працэсамі ў Еўропе, дзе паралельна ідуць адукацыя і выхаванне. Там на уроках літаратуры не так, як у нас: апішыце вобраз Гусляра ці яшчэ каго… Напрыклад, у Даніі, дзе я вельмі ўважліва прыглядаўся да адукацыі, на першым месцы ў школах урокі мовы і літаратуры. А з літаратуры на першым месцы — паэзія! Легенды, сагі пра сваіх герояў, пра сваю выдатную зямлю: самая лепшая зямля ў свеце — дацкая, самыя лепшыя героі — таксама нашы!

— Я двойчы быў у Даніі і гэта заўважна: датчане надта беражліва ставяцца да сваёй спадчыны, гісторыі. Бо настаўнікі там выхоўваюць нацыянальную свядомасць, вось што галоўнае.

— Абсалютна! А як практычна гэта робіцца? У Даніі ніякай мовы, акрамя дацкай, няма. Толькі



Сяргей Законнікаў з Генадзем Бураўкіным



«Шчымлівая споведзь збалелай душы»

з шостага класа ўводзіцца нямецкая мова. Гэта робіцца для таго, каб замацавалася свая родная мова, якую чалавек ніколі не забудзе, будзе шанаваць і любіць.

— Сяргей Іванавіч, а ці былі часы, калі ты вагаўся, калі даводзілася ісці насуперак сваім перакананням ужо ў сталым узросце, здрадзіць у чымсьці.

— Што тычыцца чыста чалавечых стасункаў, я табе скажу, што па жыцці магу спакойна глядзець у вочы людзям. Падчас працы ў газетах, у ЦК КПБ і шмат дзе яшчэ я ніколі не рабіў подласці.

— Твая жонка Лілія Рыгораўна для цябе толькі каханая жанчына ці яшчэ твой крытык, паплечнік і сябра?

— Наконт крытыка ўжо занадта! Але хачу сказаць, што яна для мяне з часоў маладосці застаецца эталонам прыгажосці і жаноцкасці да сённяшняга дня. Яна ўжо, як кажуць, бабуля, у якой унукі. Аднак, калі я гляджу на яе, я не бачу ніякай бабулькі. Я бачу тую прыгожую, з вяснушачкамі, смяшлівую, задзірыстую і вясёлую дзяўчыну, якая мне вельмі падабалася.

Што тычыцца творчасці, яна ніколі мне не замінала, а рабіла ўтульнасць у хаце, каб дапамагчы. Хаця элементарнай утульнасці ніколі ў маладосці не было, таму што кватэры ў нас не было, нічога не было. Ты не паверыш, мы жылі некалькі месяцаў на гарышчы ў Вушачах, таму што не было дзе жыць. А яна ўжо цяжарная была. На кватэру нас не хацелі браць, бо людзі бачылі, што цяжарная, будзе дзіцё, будзе шумна ў хаце… Здарылася, што ўжо канец верасня, пачатак кастрычніка, ужо іней на нашых галовах, а мы спім на гэтым гарышчы. І мы гэта ўсё прайшлі з ёю. У Мінску матляліся па прыватных кватэрах ужо з дзіцём. Мы шмат што прайшлі і перажылі. І заўсёды Ліля гаварыла: «Як ты лічыш патрэбным, так і рабі».

— Ты лічыш сябе ўсё ж такі шчаслівым чалавекам, бо ў творчасці ты адбыўся, адбыўся таксама як бацька, як дзед — у чым тваё шчасце?

— Што тычыцца творчасці, ніколі не трэба думаць, што ты схапіў бога за бараду. Я магу сказаць, што ў мяне ёсць неблагія чатыры паэмы. У мяне ёсць два дзесяткі добрых вершаў, за якія мне не сорамна ні перад кім. Што тычыцца астатняга, то я стараўся ўсё зрабіць больш-менш добра. Але на сёння я вельмі задаволены, як да мяне ставяцца чытачы і крытыкі. Усё ж такі стукнула 70 гадоў і, як бы ты не думаў, што ты малады сваім розумам, хоць у цябе «запчасткі» нейкія адвальваюцца… І ў такім узросце, аглядаючыся на сваё жыццё, творчымі справамі я абсалютна задаволены. Вось тут, у тэчцы, артыкул, які выйдзе ў часопісе «Роднае слова», — «Шчымлівая споведзь збалелай душы. Паэтычны эпас Сргея Законнікава». У гэтым артыкуле ацэньваюцца мае паэмы і гэта для мяне важна. Піша кандыдат філалагічных навук Наталля Заяц. Мне спадабалася, што яна як спецыяліст разглядае мае паэмы ў самым цесным яднанні з нашай гісторыяй, з нашым народам. Я ёй вельмі ўдзячны, што яна адзначыла, што мая творчасць дапамагае нацыястварэнню, пра што мы з табой гаварылі.

Што тычыцца жыццёвага боку, я таксама вельмі шчаслівы чалавек. Я быў шчаслівы, калі нарадзілася мая першая дачка, потым другая дачка. Я быў шчаслівы, калі мяне сустракалі людзі ва Украіне, у Польшчы з маімі вершамі і перакладамі на іхныя мовы. З акцёрамі я выступаў у тэатрах па ўсім свеце. У многіх краінах я гэта рабіў, зарабляючы грошы для нашых хворых чарнобыльскіх дзетак — на медыцынскае абсталяванне, лекі, вітаміны. І тады я таксама быў шчаслівы.

Фотаздымкі Уладзіміра Крука, з архіва Сяргея Законнікава

«Янки голос соловьиный…»

Міхась СКОБЛА

Падымаеш галаву ў маскоўскім метро, і проста над табой — даваенны герб БССР. Такое адчуванне, што ён табе на макаўку зваліцца. Спрабуеш інстынктыўна ўхіліцца, але вірлівы натоўп падхоплівае цябе і, не даўшы апамятацца, нясе да эскалатара. А ў таксоўцы ездзіць па Маскве — трэба мець вялікае цярпенне і яшчэ больш часу. Як на добры розум, масквічам варта пратэставаць не толькі супраць трэцяга-чацвёртага тэрміна Пуціна ці развязанай ім вайны ва Украіне, але і супраць аўтазатораў, бо свабоду кожнай асобна ўзятай асобы на маскоўскіх вуліцах абмяжоўваюць найперш яны. «Заплутаным і невыразным горадам» назваў перадрэвалюцыйную Маскву Янка Купала. І гэта ў той час, калі па ёй ездзілі толькі рамізнікі ды рэдкія аўто, а самым хуткім сродкам транспартных зносінаў лічыўся самакат. Што б сказаў Купала пра сённяшнюю Маскву?

Зрэшты, на Кутузаўскім праспекце, дзе сённяшняя Масква дала прапіску Купалу, затораў практычна не бывае. Пешаходныя пераходы схаваныя пад зямлю, святлафораў таксама не відно, і шматпалосная аўтастрада ў сваім імкненні вырвацца за акружную дарогу нагадвае ўзлётную паласу ў кірунку Беларусі. Настаяўшыся на скрыжаваннях у цэнтры горада, легкавікі тут ідуць пад сотню, не асцерагаючыся гібэдэдэшнікаў.

Купала стаіць у акуратным скверыку на невысокім пастаменце, апершыся на поручні. «Мо нізка поручні былі / у тым гатэлі?» — адразу ўспамінаюцца радкі Сержука Сокалава-Воюша. Няма ўжо таго маскоўскага гатэля, у якім паэт загінуў 28 чэрвеня 1942 года. Мясцовыя беларусы спрабавалі адшукаць архіўную справу аб ягонай загадкавай гібелі. Справа знішчаная — такі быў афіцыйны адказ. І тут адразу напрошваецца пытанне: калі тую справу спачатку засакрэцілі, а потым знішчылі (у што верыцца слаба), то, значыцца, расійскія спецслужбы не хацелі выдаваць нейкай інфармацыі адносна смерці Купалы?

Відаць, у той справе былі адпаведныя інструкцыі, імёны агентаў ды іх данясенні? Відаць, былі нейкія рэзалюцыі на спецпаведамленні, адпраўленыя ў тыя трагічныя дні на імя Сталіна і Берыі, дзе, дарэчы, Купала тройчы названы чужым прозвішчам — Луцкевіч. Маўчаць маскоўскія архівы, маўчыць бронзавы Купала на Кутузаўскім праспекце, маўчыць за яго спінай новамаскоўскі халодны краявід са шклянымі хмарачосамі.

Калі помнік у 2006 годзе ўсталёўвалі, неяк падышлі да яго маскоўскі пісьменнік і маскоўскі беларус, які ўсё жыццё рупіўся пра ўшанаванне памяці песняра ў Маскве. Пісьменнік іранічна пасміхнуўся і, кіўнушы на манумент, спытаўся: «А не великоват ли? Ведь, поди, вровень с Пушкиным будет…»

У гэтым пытанні — праўдзівае стаўленне расійцаў і да Янкі Купалы, і да незалежнай Беларусі. Маўляў, не павінен «малодшы брат» зраўняцца са «старэйшым» нават вышынёй помнікаў сваім галоўным паэтам. І тут справа не ў маштабах літаратурных талентаў, а ў нечым яшчэ больш істотным, што мелі на ўвазе тыя самыя расійцы ў сціслай формуле: «Пушкін — наша ўсё».

Мне прыгадваецца гісторыя, пачутая калісьці ад Янкі Брыля. Падчас нейкага літаратурнага свята ён жыў у адным гатэльным нумары з пісьменнікам-таджыкам.

Вярнуўшыся вечарам з банкета, яны працягвалі гаворку пра дружбу народаў — дружбу літаратур. І тут таджык пытаецца: «За што вы так узвышаеце свайго Купалу? Чытаў я яго ў расійскіх перакладах — нічога асаблівага». Брыль пачаў казаць, што поўны Купала да гэтай пары не перакладзены, пачаў наракаць на перакладчыкаў-халтуршчыкаў. А потым вырашыў ураўнаважыць спрэчку і заўважыў, што і веліч Фірдаусі значна перабольшаная. Пачуўшы такое, таджык ледзь не кінуўся на беларуса з кулакамі. А можа, і кінуўся б, каб не двухметровы брылёўскі рост і выбучка былога марпеха. Але пра тое, што Фірдаусі — самы геніяльны паэт усіх часоў і народаў, пачуў у той вечар увесь гатэль…

Помнік Янку Купалу ў Маскве ўсталяваны гадоў дзесяць таму, але да гэтай пары афіцыйна не адкрыты. Чаму? Невядома.

Беларуская амбасада раіць маскоўскім беларусам забыцца на гэты факт. Для яе гэтае пытанне закрытае. Але як можна, даруйце за каламбур, закрыць неадкрытага Купалу? Тым больш памятаючы, якія палымяныя прамовы гучалі і колькі шампанскага вылілася ў Свіслач на адкрыцці помніка Пушкіну ў Мінску.

Штодня па Кутузаўскім праспекце праносіцца прэзідэнцкі картэж. Праехаць міма і не заўважыць Купалу немагчыма — хвала за гэта маскоўскім архітэктарам. А заўважаючы, пра што думае ВДЛ (высшее должностное лицо — са слоўніка гібэдэдэшнікаў) Расіі? На ягоны запытальны погляд памочнік мог бы працытаваць радкі Дзям'яна Беднага: «Янки голос соловьиный / превратился в шип змеиный». «А за што гэты Янка ўдастоіўся такой джалячай эпіграмы ад крамлёўскага сатырыка?» — магло б пацікавіцца ВДЛ, азірнуўшыся на ўсталяваны пры «страціўшым давер» мэры Лужкову помнік. І памочнік, клацнуўшы накрыўкай свайго айпэда-ўсязнайкі, мог бы прачытаць верш пра расійскага чынадрала:

Он снит былую мощь и ширь:
Цари, царицы, царский трон,
Погромы, каторги, Сибирь…
О Русь! Прими раба поклон!
Разбитых не сорвёшь оков
И ты, Москвы отребье, знай:
Былых не воскресишь веков,
С какой брехнёй не вылезай…

У Маскве не адкрыты не толькі Купала-помнік. У Маскве не адкрыты і Купала-паэт. Перакладзены ён на расійскую мову (за нешматлікімі выняткамі) дрэнна. Каб не быць галаслоўным, прывяду некалькі яскравых прыкладаў неадэкватнагаператлумачэння ягоных твораў.

У Купалы: «*Там за вёскай у полі / тры стаялі таполі*». У перакладзе Эдуарда Багрыцкага атрымалася: «*За околицей в грозы (?) / три стояли берёзы*».

У Купалы: «*Чаго вам хочацца, панове, / які вас выклікаў прымус…*». Перакладчык С. Спаскі сёе-тое падправіў: «*Чего вам, господа, угодно? / Что растревожило ваш вкус?*». Пагадзіцеся: прымус і вкус — зусім не сінонімы.

У Купалы: «*Як вецер, свабодны мой дух, / хоць рукі закуты ў ланцуг*». У перакладчыка Р. Куранёва выйшла стылёва нязграбнае: «*Как ветер, свободен мой дух, / хоть горя таскаю за двух*».

Купала піша: «*Годзе заходняй і ўсходняй культуры*». Выхадзец з Магілёўшчыны масквіч Іван Бурсаў перакладае: «*Хватит свои прививать нам культуры*».

А вось як гучыць па-расійску вядомы купалаўскі верш «…О так! Я — пралетар!»: «*Я — пролетарий… Это я — / покорный раб, вчерашний нищий, / низвергнув бога и царя, / всем на земле владею нынче*». Але Купала ў арыгінальным тэксце не зрынае Бога. Навошта той жа Куранёў зрабіў атэістам беларускага паэта, які, да слова, вянчаўся ў маскоўскім Петрапаўлаўскім касцёле?

Купала пачынае верш «Царскія дары» так: «*Цар грозны, маскоўскі, вясёлы…*» Той жа Бурсаў па-зямляцку самаўпэўнена падпраўляе песняра: «*Хмельной от побед царь московский…*»

Часам перакладчыкі (ці рэдактары) папросту скарачалі купалаўскія вершы. Гэтак, з вершаў «Прыстаў я жыць» і «Паўстань» выкінута па дзве страфы, у тым ліку знакамітыя фінальныя радкі: «*Паўстань з народу нашага, Ўладар, / і адбудуй свой збураны пасад*». Думаецца, скароты гэтыя насілі яўна невыпадковы характар. І добра, што падобная перакладчыцкая дзейнасць яскрава паказаная ва ўкладзенай доктарам Аляксеем Каўкам кнізе Янкі Купалы «Молодая Беларусь», што дзіўным чынам пабачыла свет у 2008 годзе ў маскоўскім выдавецтве «Московский писатель».

Купала застаецца неадкрытым у тых шматлікіх перакладных кнігах, што выходзілі ў розныя часы ў Маскве і Ленінградзе. Купала застаецца закрытым у архівах ФСБ. Помнік на нелегальным становішчы… І тут асабліва не паўстанеш, як тыя Прарок, Ваяк і Уладар у аднайменным вершы…

Адкуль жа такія дзіўныя, калі не сказаць непрыяцельскія, адносіны да беларускага класіка? Няўжо ізноў «Янки голос соловьиный превратился в шип змеиный»? Дарэчы, верш гэты напісаны ў Крамлі, дзе жыў Дзям'ян Бедны ў раскошнай кватэры.

Media Weekend у Гародні

Занятыя рознымі медыяпраектамі, супрацоўнікі беларускіх СМІ неапраўдана рэдка адрываюцца ад сваіх лаптопаў ды планшэтаў, каб прааналізаваць уласныя магчымасці і перспектывы на фоне беларускай медыяпрасторы. Аднак напрыканцы верасня паўсотні беларускіх журналістаў, блогераў, рэдактараў і медыяэкспертаў сабраліся ў Гародні. Важнай адметнасцю гэтага форума былі не толькі новыя знаёмствы, але і магчымасць падзяліцца досведам — як дабіцца поспеху і здабываць свой «хлеб надзённы».

Гародня ўпершыню стала знакавай дыскусійнай пляцоўкай, бо на гэты раз тут сабраліся прадстаўнікі СМІ з самых розных куткоў краіны. «Хтосьці займаецца больш кантэнтам, хтосьці рэкламай, хтосьці кіруе дзейнасцю рэдакцыі. Нехта працуе ў Мінску, нехта ў рэгіёнах і робіць добрыя медыяпраекты. Ідэя была такой, што тут прагучыць шмат розных развагаў адносна таго, што чакае нашы медыя ў будучыні, на чым трэба факусавацца зараз, якія выклікі нас чакаюць, хто і якія мае добрыя практыкі. І, мне здаецца, з гэтага пункту гледжання медыя-кэмп трэба прызнаць паспяховым», — лічыць арганізатар журналісцкага форума, старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Цэнтр інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў "Трэці Сектар"» **Вітаўт Руднік**.

Сапраўды, два дні інтэнсіўных майстар-класаў, дыскусій, прэзентацый і выступаў дазволілі ўдзельнікам гэтай сустрэчы паглыбіць свае веды па шэрагу актуальных пытанняў. Напрыклад, як паспяхова весці і прасоўваць свой інфапраект у сучасных умовах ці як рэагаваць на некантраляваныя змены ў інтэрнэт-прасторы.

Хітрыкі сацыяльных сетак

Займальнымі фактамі і заўвагамі адносна працы ў сацыяльных сетках падзяліўся журналіст і медыяэксперт **Паўлюк Быкоўскі**.

Паводле апошніх даследаванняў, найбольш паспяховая мадэль публікацыі ў сацсетках на сённяшні дзень выглядае наступным чынам.

Кароткі уступ ад 40 да 140 знакаў. Пасля чаго ідзе зацемнены фотаздымак, на якім змешчаны анонс, пытанне або надпіс. Затым дадаецца загаловак артыкула, які не паўтарае, а працягвае думку, што пазначана ў надпісе на фота. «Атрымоўваецца, што мы працуем зусім незвычайным чынам. У нас ёсць артыкул з загалоўкам. Мы шукаем да яго ілюстрацыю для фэйсбука, якую наўмысна "псуем", зацямняем. На ілюстрацыі пішам яшчэ адзін тэкст, які паўтарае гэты загаловак, да якога пішам падводку. Акрамя таго, трэба напісаць кароткую агульную падводку да ўсяга гэтага. На сённяшні дзень гэта самы паспяховы метад», — заўважае эксперт.

Як прыцягнуць увагу публікі ў сацсетках і не згубіць аўдыторыю? Падчас сваёй прэзентацыі Паўлюк Быкоўскі падказаў яшчэ некалькі прыёмаў.

Трэба пазначыць на фотаздымку знакавую асобу. Напрыклад, такую як Мікалай Статкевіч, і яго шматлікія сябры ўбачаць гэтае фота. Таксама карысна рабіць *«брацкія магілы» з фотаздымкаў*, бо групавыя фота людзі заўсёды лайкаюць ахвотна. Падлічыўшы колькасць знакаў і словаў, вельмі важна пабудаваць пост такім чынам, каб на апошнім сказе, які высвечваецца ў стужцы, тэкст хацелася разгарнуць і чытаць далей.

Асобную ўвагу заслугоўваюць так званыя *коцікі*, якіх можна смела выкарыстоўваць, каб зняць напружанне ў ланцугу навін альбо калі няма чым запоўніць кантэнт. Даказана, што «коцікі» выклікаюць найбольш пазітыўную рэакцыю сярод іншых «мімімішных» жывёл. Акрамя таго, цалкам магчыма даваць новае жыццё старым матэрыялам, ствараючы *падборкі*, якія людзі любяць чытаць, бо баяцца прапусціць нешта важнае. *Правакацыйныя пытанні і «хатніх» троляў* можна выкарыстоўваць для «разгойдвання» аўдыторыі. З дапамогай спрэчак можна падтрымліваць яе актыўнасць амаль бясконца. Спосаб не зусім этычны, але, як зазначыў эксперт, прысутнічае. Пры гэтым трэба быць асцярожным з так званымі чужымі тролямі, то бок людзьмі, якія пішуць радыкальныя і адмоўныя выказванні і актыўна з усімі сварацца. Тут схавана небяспека патрапіць на правакацыю альбо дыскрэдытацыю. «Хатняга» троля душыць не трэба, але варта сачыць, каб ён не зайшоў занадта далёка.

Яшчэ адзін з падыходаў: *што чытаць за ланчам*. Многія людзі пачынаюць актыўна карыстацца навінамі падчас абеда. Хтосьці стаіць у чарзе ў сталовай, хтосьці прыбег дадому і чакае, пакуль жонка падагрэе ежу. Паступова чалавек прывыкае, што абед для яго — час навінаў. Але часу гэтага вельмі мала, таму падборкі, якія можна прачытаць за абедам, мусяць быць цікавымі і карыснымі. Таксама важна памятаць, што зараз алгарытм у сацыяльных сетках робяць такім чынам, каб людзі не пакідалі іх і нікуды не пераходзілі. Таму, каб пераадрэсаваць публіку на сайт і пры гэтым не страціць аўдыторыю ў сетцы, неабходна спалучаць два падыходы.

Публікаваць тэксты са спасылкай і таксама рабіць асобныя посты, якія людзі будуць проста лайкаць. Частка публікацый мусіць быць падрыхтавана выключна для чытання ў сацсетках.

«Калі мы працуем з сацыяльнымі сеткамі, трэба ўяўляць сабе, як гэта будуць бачыць карыстальнікі. Бо на розных прыстасаваннях розныя стандарты. Мы пішам тэкст, каб укласці сваю думку. Але яго могуць не прачытаць. Калі ты пішаш для вялікай аўдыторыі, ніхто не абавязаны гэта чытаць. Але зусім іншая справа, калі ты пішаш сябру», — дадае Паўлюк Быкоўскі.

Парады ад 34mag.net

Як сябраваць з чытачамі, расказаў рэдактар часопіса *34mag.net* **Антон Кашлікаў**. «Сябраваць з чытачамі трэба не толькі з-за таго, што яны купляюць вашу газету альбо наведваюць ваш сайт. Вельмі важна, каб была зваротная сувязь! Аўдыторыя — гэта сацыяльная сетка, не ў сэнсе фэйсбука, а ў сэнсе «сарафаннага радыё». Лепшы спосаб прасоўваць вашы ідэі — калі гэта робяць самі чытачы. Чытачы — твае сябры, бо яны адстойваюць і падтрымліваюць задуманае табой. Журналісцкая праца — гэта не толькі ваш сайт, але і ўсё тое, што вы робіце вакол вашага брэнда. Ваша задача — працаваць над тым, каб ваш брэнд станавіўся як мага больш распазнавальным. Каб вашы чытачы асацыявалі сябе з вашым выданнем. Размаўляйце з імі ў рэжыме оффлайн, на тусоўках: якія ў вас праблемы, што чытаеце, чаму нас не чытаеце? Людзям заўсёды падабаецца расказваць пра сябе. Пасля такіх размоў нарадзілася вельмі шмат ідэй, якія мы ўвасобілі ў розных праектах. Будзьце адкрытымі!» — раіць малады рэдактар. Акрамя таго Антон Кашлікаў адзначыў, як важна сёння шукаць і выкарыстоўваць новыя формы і каналы камунікацыі. Зусім нядаўна 34mag.net запусціў сістэму *push*-паведамленняў, што адразу прынесла плён — больш за 20 тысяч новых падпісчыкаў. «Людзі заўсёды рэагуюць на новыя гісторыі, новыя фарматы. Падглядзелі на літоўскім сайце рэпартаж з канцэрта, які цалкам быў створаны з гіфак. Праўда, сайт гэта занадта грузіць, але тым не менш справаздача пра падзею атрымалася вельмі жывой. Хочам паспрабаваць рабіць аўдыёдакументалкі. Увесь час нешта новае спрабуем. У фестывалях удзельнічаем. Выпускаем налепкі, торбачкі, цішоткі з цікавымі надпісамі. Выходзілі на нуль, але заўсёды нешта адбывалася». Сам Антон лічыць, што ніякага асаблівага сакрэту поспеху няма, таму што кожны ў выніку праходзіць свой шлях. «Мая парада: адкрываць нешта сваё, няхай маленькае, але сваё. Нядаўна пазнаёміўся з дзвюма блогеркамі з Польшчы і Латвіі, якія гэтым зарабляюць. Маюць па 50 тысяч назіральнікаў у інстаграме ці ў фэйсбуку. Ім па 22 гады і яны гэтым зарабляюць. Знайшлі сваю аўдыторыю. А брэнды любяць вялікую аўдыторыю і дапамагаюць дзяўчатам зарабіць. У Беларусі такіх прыкладаў вельмі мала, і я б раіў, калі ў вас няма магчымасцяў знайсці інвестыцыі, але ёсць жаданне нешта рабіць, пачынайце за свой кошт. Шукайце шляхі аб'яднання з іншымі людзьмі. Калі вы не ўмееце рабіць здымкі, але ўмееце пісаць, ёсць фатографы, з якімі можна пасябраваць. Вельмі шмат можна рабіць на валанцёрскіх пачатках і на звышвысілках. Хутчэй за ўсё, пачатак будзе менавіта такім, калі вы толькі пачынаеце свой праект. Але калі вы пэўны час пратрымаецеся, з вашага праекта можа выйсці нешта сапраўды вартаснае. Карацей, я — за тое, каб пачынаць рабіць свае ўласныя праекты, кааперавацца і прыдумляць».

Дзе знайсці грошы на медыяпраект?

Крэатыўны дырэктар *Talaka.by* **Іван Вядзенін** назваў некалькі спосабаў, як сабраць грошы на медыяпраект праз краўндфандынг. Праект збору грошай «талакой» на сённяшні дзень у Беларусі далёка не новы, аднак яго назву многія з цяжкасцю вымаўляюць і дагэтуль. Таму «талакоўцы прыдумалі сваю моўную версію краўндфандыга, прасцей — "талакошт"». З 2012 года «Талака»

